Беларусь сегодня

## Что стоит почитать?

**Продолжаем наш проект, в котором известные люди Беларуси делятся своим читательским опытом. Мы просим всех ответить на два вопроса:**

1. Какую книгу вы прочитали последней?

2. Какую книгу или книги вы посоветуете почитать?

**Ждем и ваших комментариев, дорогие читатели!**

**Михаил Поздняков, поэт, прозаик, переводчик, председатель Минского городского отделения Союза писателей Беларуси:**



1.Читаю очень много (еще и должность обязывает). Двухтомник Анатолия Аврутина «Времена» (стихи и переводы); книгу стихов Валентины Поликаниной «Не сдавайся времени, душа»; книгу стихов и прозы Виктора Шнипа «Тутэйшая туга»; книгу очерков Вячеслава Бондаренко «Герои Первой мировой»; книгу Николая Чергинца «Операция «Кровь»; перечитал роман Льва Толстого «Война и мир» (можно написать большое эссе об ощущениях, восприятии, впечатлениях...); книгу русского писателя Александра Арцибашева «Божии поля»; книгу избранной лирики классика китайской поэзии Ли Бая в переводе известного нам минского преподавателя Ли Цзо; массу конкурсных произведений юных литераторов Минска (порадовался способностям духовно здоровой и талантливой молодежи)...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2.Книги Наума Гальперовича «Сюжэт для вечнасці» и «На трапяткім агні»; названные книги Виктора Шнипа, Анатолия Аврутина, Валентины Поликаниной; книги Наталии Костюченко «Верба над омутом» и «Водгукі маўчання» (прочитал запоем и с восхищением ранее). В этих книгах очень много искреннего, животрепещущего, волнительного, вечного... А еще романы Алеся Савицкого «Пісьмо ў рай»; Владимира Гниломёдова «Вяртанне», «Ліхалецце», «Пасля вайны»; Николая Чергинца «Операция «Кровь»; Вячеслава Бондаренко «Герои Первой мировой», повествующие о переломных этапах в жизни страны, о тяжелых испытаниях, выпавших на долю мирных граждан, о вселенском добре и зле. Они учат, предупреждают, взывают к милосердию, человечности...

**Алесь Кветковский, художник:**



1. Чытаю дэтэктывы — нарвежскіх, шведскіх, фінскіх аўтараў. Гэта не толькі масавае чытво, з яго даведваешся пра культуру, прыроду краін. Нядаўна прачытаў апошні зборнік паэта Віктара Шніпа «Тутэйшая туга», зборнік вершаў Міколы Кандратава. Рыхтуюся да пленэру ў Багданава, прысвечанага 144–годдзю Фердынанда Рушчыца. Калі бываў там, мяне ўразілі могілкі, гэтак жа, як могілкі ў Вішнева ці ў Дзясятніках, з пахаваннямі часоў Першай сусветнай вайны — непадалёк праходзіла лінія фронту. Але як мала мы ведаем пра тое, што тады адбывалася. Таму збіраюся найперш перачытаць Рэмарка.

2. На паліцы ў маёй майстэрні стаяць кнігі, да якіх я час ад часу вяртаюся. Гэта «Чазенія» Уладзіміра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Караткевіча, «Выбранае» Андрэя Вазнясенскага, «Лён» Анатоля Сыса, «Балада камянёў» Віктара Шніпа, зборнік вершаў польскага паэта XIX стагоддзя Цыпрыяна Норвіда ў перакладзе на беларускую мову.

**Галина Дягилева, художественный руководитель театра одного актера «Зніч»:**



1. Чытаю і перачытваю тое, што хачу перанесці на сцэну. Вось ужо тры гады разважаю над прозай польскага пісьменніка Стэфана Жэромскага, па якой мару паставіць спектакль.

2.У нас ёсць спектакль «Пяюць начлежнікі» па творах Змітрака Бядулі. Давялося вывучаць творчасць паэта, ягоную біяграфію. Вельмі цікавы погляд на жыццё чалавека, які належаў да габрэйскай нацыі і вельмі любіў Беларусь. Такая інтэлігентнасць, такая дабрыня... Першы твор, які ён напісаў на беларускай мове, — «Пяюць начлежнікі», і даў назву нашаму спектаклю. Пра што спектакль? Пра тое, што чалавек прыйшоў у свет дзеля таго, каб цаніць яго прыгажосць — але і пацярпець крыху, як і продкі цярпелі. І каб сваімі добрымі справамі і пачуццямі выправіць, што яны зрабілі. І творы ж не вельмі радасныя: пра тое, як мужык б’е жонку, хлопчыку, які хоча стаць мастаком, бацькі не дазваляюць мець фарбы... Як бацькі не пазнаюць сына, што вярнуўся дадому пасля доўгай адсутнасці... Але застаецца светлае адчуванне. Таму раю чытаць творы Змітрака Бядулі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ирина Масленицына, писатель, историк:**



1. Серия книг американской писательницы Стефани Майер «Сумерки». Почему? Поймут те, у кого дети–подростки интересуются подобной литературой. Я считаю, что родители должны хотя бы изредка брать в руки то, что интересует их детей. Был и профессиональный интерес: понять, чем же эта автор так «зацепила» юную аудиторию? Почему моя дочь перечитывает эти книги? Кажется, я ответила для себя на этот вопрос. Там именно те проблемы, которые есть у детей подросткового возраста. Все они мечтают о самой необычной любви. А тут, пожалуйста, мальчик–оборотень, мальчик–вампир. Это та ниша, которая не заполнена у нас. Прочитала рассказ Богомолова «Иван», который дочь изучает по школьной программе. По рассказу Тарковский снял фильм, но не все знают, что в литературном источнике главный герой — наш земляк, мальчик с Гомельщины.

2. Жизнь не такая длинная, чтобы тратить ее на недостойные тексты. После 30 — 40 лет советую вернуться к студенческим и школьным спискам классики. Ведь прочитывается далеко не все.

**Алексей Дударев, драматург:**



1. Заўсёды чытаю і перачытваю Чэхава.

2. Класіку беларускай літаратуры — Караткевіча, Быкава... Яшчэ раю, калі выходзіць фільм, асабліва экранізацыя, чытаць і ягоную літаратурную аснову — таму што кіно і літаратура ўсё–ткі розныя жанры. Зараз, калі выйшаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фільм «Белыя росы–2», варта прачытаць ягоны сцэнар. Ён друкаваўся ў газеце «Советская Белоруссия» у 2011 годзе і ў часопісе «Неман». Чытайце, параўноўвайце, разважайце.

**Наталля Кучмель, поэтесса:**



1. Сколько ни пыталась читать современную «молодую» поэзию или прозу — возникает один вопрос: ну почему они все такие нервные, дерганые? В чем дело — то ли в убыстряющемся ритме жизни, то ли в том, что они «переехаsuccessfully» Бродским, а после Бродского почти невозможно писать так, как будто бы его не было... А может, в том, что люди в детстве, в юности оторваны от природы, которая именно и приучает к поспешному наблюдению. Там, где я работаю, через дорогу стоит элитная гимназия. И время от времени во двор забегают белки. Но вот что меня порадовало: иду я как–то на работу, полон двор детей, а по веткам скачет белка. Я, естественно, остановилась поглядеть. А из этих детей никто не поднял голову. Ни один! Дети, которым неинтересна белка... Хотелось бы понять, это случайность или тенденция?

2.Что читать? Ну, в основном Ремарка. «Черный обелиск», «Тени в раю», «Жизнь взаймы». Ну и «Триумфальную арку». Мне кажется, эти книги наиболее четко показывают, что в жизни главное, а что — нет.



**Серж Минскевич, поэт, переводчик:**

1 - 2. Прачытаў (дачытваю і вельмі павольна і смакуючы, абмазгоўваючы і здзіўляючыся)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кнігу казак братоў Грым у перакладзе Альгерда Бахарэвіча. Пераклад неадаптаваны, то бок казкі такія ж, якія яны ёсць у братоў Грым. Кожная дае шмат нагодаў задумацца і паразважаць, адкрывае/ускрывае бакі чалавека/асобы/звера/героя.



**Татьяна Будович, поэтесса:**

1 - 2. В последнее время прочитала роман Валерия Гапеева «Праклён», эссе Марийки Мартысевич «Цмокі лятуць на нераст» и сборник стихов Дианы Арбениной. Все это советую читать, потому что это книги, после которых хочется жить.

**Ирина Шевлякова, критик, начальник управления научно–методического сопровождения образовательного процесса Национального института образования, кандидат филологических наук:**



1. Рыхтую аглядны артыкул творчасці беларускага празаіка Алеся Асташонка да 60–годдзя пісьменніка. Прачытала ягоныя зборнікі «Жоўты колер белага снегу», «Белыя фарбы душы». Уражанне эмацыйна цяжкае, асабліва калі ведаць пра трагічны лёс пісьменніка. Два яркія — і супрацьлеглыя — уражанні ад замежнай літаратуры — гэта раман–трылогія брытанца індыйскага паходжання Амітаба Гоша «Макавае мора», так званы каланіяльны раман. Зусім іншае ўражанне — кніга сербскага пісьменніка Бора Чосіча «Роль моей семьи в мировой революции». Цікавы канструктывізм, але з фрагментаў не складваецца мастацкі твор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Нядаўна мяне папрасілі назваць пяць лепшых кніг беларускай літаратуры за апошнія 10 гадоў (менавіта кніг, а не асобных твораў). У мяне атрымалася наступнае: «Мільярд udараў» Юрыя Станкевіча, «Нічые» Андрэя Федарэнкі, «Сутарэнні Ромула» Людмілы Рублеўскай, «Каменданцкі час для ластавак» Алены Брава і «Жылі–былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» Пятра Васючэнкі. Гэта кнігі, з якіх любой катэгорыі чытачоў варта пачынаць знаёмства з беларускай літаратурай, таму што ў гэтым пераліку ёсць тэксты на любы густ.

**Ольга Гронская, поэт, переводчик, доцент кафедры белорусской филологии и всемирной литературы БГУКИ:**



1. Апошняй прачытанай разам з сынам кнігай стаўся «Найлепшы спявак у свеце» Ульфа Нільсана і Эвы Эрыксан у цудоўным перакладзе Алесі Башарымавай. Дагэтуль чыталі «Алісу ў краіне цудаў» у пераказе Барыса Захадэра — адну з маіх самых любімых з дзяцінства гісторый. Калі ж усё–ткі гаварыць пра дарослую літаратуру, то апошняе, што пакінула моцны след, — гэта «Хронікі кахання» Ніколь Краус. Кніга пра самыя важныя рэчы — адзіноту, жаданне быць некаму патрэбным, успаміны, шчырасць і чэснасць перад самім сабой, каханне...

2.Пэўныя кніжкі трэба чытаць у пэўны сезон. Ёсць зімовыя кніжкі, якімі хораша грэцца доўгімі халоднымі вечарамі. А ёсць, напрыклад, і летнія, якія трэба чытаць у адпачынку: на лавачцы пад язмінам або лежачы на траве, напрыклад. Бадай што самая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вядомая з такіх летніх кніжак — «Віно з дзьмухаўцоў» Рэя Брэдберы. Яшчэ адзін твор, які адсылае да лета самой сваёй назвай, — «Летняя кніга» Туве Янсан. Гісторыі пра адну сям'ю, у якіх ну вельмі няўлоўна адчуваецца дух тых самых мумі–троляў. Хораша летам чытаць і раманы Джаан Харыс. Асабліва «Шакалад» і «Ажынавае віно». Ужо самі назвы якія смачныя! Летам варта было б таксама пачытаць (або перачытаць) «Атлас, складзены небам» Горана Петравіча. На маю думку, ён вельмі добра дапамагае тым, хто стаміўся ад навакольных праблем, будзённасці і рэальнасці наогул.

**Василий Коктыш, генеральный директор УП «Киновидеопрокат»:**



1.Перечитал «Сто лет одиночества» Габриэля Гарсиа Маркеса. Я читал и другие произведения этого великого писателя, «Полковнику никто не пишет» и прочее. Но именно роман «Сто лет одиночества» произвел самое сильное впечатление. Лучше сделать автор не смог. Философская притча о том, что даже сильный род уходит и следа от него не остается.

2. В последнее время все чаще экранизируют классику. Но советую всегда читать и литературную основу. Кино не заменит книгу, удачные экранизации бывают редко. Интернет развивает познание, но не мышление. Можно литературу закачивать из интернета... Но настоящую книгу, с ее запахом, не заменит ничто. В свое время читал Ивана Чигринова, Ивана Шамякина, Бориса Саченко — советую и теперь их читать. На моей полке стоят и все книги Владимира Соломахо.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Наум Гальперович, поэт:**



1. Кнігі Валерыя Гапеева «Я размалюю для цябе неба», Рыгора Барадуліна «Ксты», Юрыя Станкевіча «Брамнік заўжды самотны». Перачытваў свайго любімага Арсенія Таркоўскага і кнігу ўспамінаў Н.Мандэльштам пра Восіпа Мандэльштама. Ляжыць на пісьмовым стале раман Васіля Гросмана «Жизнь и судьба». Вяртаюся да асобных старонак, глыбокай філасофіі і думак аўтара.

2. Для тых, хто часам лічыць, што ў беларускай літаратуры няма цікавых яркіх твораў, раіў бы пачытаць названых мной у пачатку айчынных аўтараў.

**Артур Клинов, художник, писатель:**



1. Зараз няспешна чытаю паралельна некалькі кніжак: Ханна Арэнт «Банальнасць зла», Ханс–Ціс Леман «Пастдраматычны тэатр» і The Irony Tower Эндру Саламона пра нонканфармісцкае мастацтва часоў перабудовы. Усе кнігі вартыя, каб пачытаць, адно што не разлічаны на шырокае кола.

2. З таго, што раю ўсім: адзін з апошніх раманаў Віктара Пелевіна S.N.U.F.F.. Я, праўда, прачытаў яго год таму, але зараз ён зрабіўся яшчэ больш актуальным у сувязі з падзеямі ва Украіне. Вельмі моцная і ў пэўным сэнсе прароцкая рэч. Таксама раю вельмі блізкі па тэме і настрою раман Дзімтрыя Быкава «ЖД». Кніга вельмі аб'ёмная, але для гурмана —

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сапраўдная асалода. Тым жа, хто баіцца тоўстых кніг, раю паслухаць аўдыёвэрсію рамана.

**Тамара Бунто, журналист:**



1.Сёлетнюю сваю «чытальню на калёсах» адкрыла са зборніка Уладзіміра Сцяпана «Адна капейка». Час у электрычцы пралятаў імгненна! Якая глыбокая проза, якая жывая мова! Я такую даўно–даўно, у дзяцінстве, чула. Пашкадавала, што не было з сабой алоўка, так і хацелася падкрэсліць у кніжцы то адно слова, то другое... Асабліва спадабаліся мне навэлы з цыклаў «Акварэльныя малюнкі. Дзед» і «Сто акварэльных малюнкаў. Бацька» — кранальныя ўспаміны пісьменніка пра сваё дзяцінства, пра дзеда і бацьку, пра родны пасёлак... Тэма вельмі блізкая і мне, ды і, бадай, кожнаму чалавеку...

2. Раю ўсім пачытаць творы Уладзіміра Сцяпана. На маю думку, гэта адзін з лепшых сучасных беларускіх пісьменнікаў.

**Александр Анисимов, главный дирижер и художественный руководитель Государственного академического симфонического оркестра Беларуси:**



1. «Диалоги с Иосифом Бродским» Соломона Волкова. Недавно перечитал «Полтаву» Пушкина, получил несказанное удовольствие.

2. Молодым музыкантам, думаю, интересно было бы прочитать последнюю книгу Татьяны Берфорд о

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

великом скрипаче Игоре Ойстрахе «Князь Игорь, сын Давидов». Неравнодушная, яркая книга.

**Егор Конев, писатель:**



1. Роман «Зов кукушки» Джоан Роулинг (опубликован под псевдонимом Роберт Гэлбрэйт). Прежде ее «поттериану» читал запоем, вот и теперь «повелся» на культовое имя. Детективы я люблю, но тут испытал горькое разочарование. Поразительное занудство! Триста страниц кряду сыщик шарит по разным районам Лондона и тянет кота за хвост, опрашивая всех встречных–поперечных. Лишь в последней части действие принимает увлекательный оборот. Тем удивительнее было прочитать в сети, будто Голливуд решил на основе «Зова кукушки» снять сериал. Возможно, потому, что с героем Роулинг определенно угадала: безногий, но очень пронырливый сыщик, этакое сочетание доктора Хауса и Шерлока Холмса, весьма привлекательный типаж.

2. «Аристономию» Бориса Акунина (псевдоним Чхартишвили). Самое увлекательное описание кошмаров русской революции и гражданской войны из всего, что читал. Дрожь пробирает при мысли о том, как легко, в считанные дни, может рухнуть в бездну любое государство. Нечто схожее переживает сейчас Украина. К этому же подталкивали и Россию во время попытки новой «февральской революции» 2012 года. Поразительно, что сам автор «Аристономии» пребывает в рядах революционеров, где окопались главным образом обозленные на весь белый свет неудачники.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роман «Операция «Кровь» Николая Чергинца. Несмотря на то что некоторые эпизоды (в основном командно–штабные) кажутся немного затянутыми, получилась очень трогательная история о детях, из которых выкачивали кровь для немецких раненых. Основа романа, как и у многих произведений Чергинца, — документальная. После выхода книги на месте событий был поставлен памятник. Думаю, полезно было бы поставить еще и фильм или сериал.

rubleuskajya@sb.by

Фото Александра РУЖЕЧКА Артура ПРУПАСА, Александра КУЛЕВСКОГО, Виталия ГИЛЯ, Александра СТАДУБА

Советская Белоруссия №134 (24517). Пятница 18 июля 2014 года.

Автор публикации: Людмила РУБЛЕВСКАЯ

Дата публикации: 00:20:37 18.07.2014

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ